# Перадваенны палітычны крызіс 1939 г. у даследаваннях кафедры міжнародных адносін БДУ

**ЛАЗЬКО Р. Р.,**
*д-р гіст. навук, праф.,*
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

Навукова-даследчая дзейнасць кафедры міжнародных адносін БДУ носіць, так бы мовіць, многавектарны характар, як і знешняя палітыка нашай Рэспублікі. Аднак пры гэтым заўважаецца канцэнтрацыя асноўных кадравых рэсурсаў на даследаванні навейшай гісторыі міжнародных адносін у рэгіёне, да якога належыць і Беларусь — у Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Значнае месца ў гэтых даследаваннях займае і вывучэнне перадваеннага палітычнага крызісу 1939 г.

На аснове ўласных навуковых вынікаў і творчага асваення дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі калектыў выкладчыкаў кафедры падрыхтаваў і выдаў у 2007–2010 гг. «Гісторыю міжнародных адносін» пад рэдакцыяй прафесара А. В. Шарапы ў чатырох тамах (частках). Трэці раздзел гэтага выдання (2-я частка) прысвечаны гісторыі міжнародных адносін 1917–1945 гг. Аўтарам параграфа дапаможніка, у якім разглядаюцца пытанні ўзнікнення і развіцця перадваеннага палітычнага крызісу 1939 г., з'яўляецца прафесар М. Э. Часноўскі. Што ў ім прыцягвае ўвагу?

Гэта перш за ўсё ўдалая рэалізацыя парады класіка адносна таго, што пісаць неабходна так, каб словам было цесна, а думкам прасторна. На адносна невялікай плошчы тэксту трэцяга раздзела аўтарам удалося ў дакладнай і яснай форме прадставіць дасягненні навукі па гісторыі аднаго з найбольш драматычных перыядаў сусветнай гісторыі. Эфектыўнае спалучэнне навуковага зместу працы з папулярнай і яснай формай выкладу дазволіла аўтарскаму калектыву прадставіць яе як вучэбны дапаможнік, што не пазбаўляе яго навуковага характару.

Другое, што неабходна адзначыць. Пытанні, якія адносяцца да ўзнікнення і развіцця палітычнага крызісу 1939 г., разглядаюцца аўтарам у сістэмным ключы з улікам узаемадзеяння усіх элементаў сістэмы еўрапейскай палітыкі, усіх яе суб'ектаў. Тым самым пераадольваюцца недахопы пануючай у гістарыяграфіі схемы, адпаведна якой разгляд узнікнення і развіцця крызісу абмяжоўваецца трохкутнікам Германія —

дзяржавы Захаду — СССР. Прыняты аўтарам падыход да праблемы дазволіў яму прадставіць гісторыю передваеннага палітычнага крызісу з дастатковай паўнатой і максімальна магчымай аб’ектыўнасцю.

Разглядаючы вытокі крызісу 1939 г., аўтар натуральна звязвае іх з палітыкай нацысцкай Германіі, якая ставіла перад сабой мэту дасягнуць пануючага становішча ў Еўропе як базы для ўстанаўлення сваёй сусветнай гегемоніі. Гэты тэзіс сфармуляваны яшчэ савецкай гістарыяграфіяй і сёння не выклікае дыскусій у сур’ёзных навуковых сферах. Аднак аўтар зыходзіць з таго, што мецъ агрэсіўныя гегеманісцкія планы — гэта адно, а быць здольным дасягнуць іх — гэта ўжо зусім іншая якасць. Таму ён ідзе далей і ставіць пытанне: хто ж адчыніў «скрыню Пандоры», стварыў тую сітуацыю, у якой Германія рашылася выкарыстаць створаны ёю ваенны патэнцыял для рэалізацыі сваіх планаў. У гэтай сувязі ён разглядае палітыку прымірэння Германіі, якую ў 1930-х гг. праводзілі заходнія дзяржавы, і пры гэтым прыводзіць мала вядомыя у нашай літаратуры факты і робіць цікавыя арыгінальныя назіранні. Так, аказваецца, у ходзе так званага «плебісцыту міру», які быў праведзены ў 1934–1935 гг. пад эгідай Лігі Нацый, звыш 10 млн брытанцаў з 11,5 млн апытаных выказаліся за ўсеагульнае раззбраенне і выкарыстанне супраць агрэсара эканамічных санкцый замест ваенных (с. 229). Звыш 2 млн чалавек выступілі супраць любой вайны. У святле гэтых фактаў палітыка прымірэння Германіі выступае ў істотна іншым асвятленні, чым яна прадстаўлялася раней, а праблема ўтаймавання агрэсара — як значна больш драматычная. У гэтым святле лягчэй зразумець ацэнку У. Чэрчылем палітыкі Англіі і Францыі, якую падтрымлівае аўтар, як узаемнае імкненне хаваць сваю пасіўнасць за пасіўнасцю партнёра.

Непасрэдна міжнародны палітычны крызіс 1939 г. (які, як хутка высветлілася, стаў перадваенным) пачаўся, як вядома, з агрэсіўных акцый фашысцкіх дзяржаў у сакавіку-красавіку гэтага года. Аўтары дапаможніка адзначаюць, што ліквідацыя Чэхаславацкай Рэспублікі шляхам аддзялення ад яе Славакіі і ўтварэння пратэктарата Чэхіі і Маравіі азначала разрыў Гітлерам Мюнхенскага пагаднення. Тут магчыма дадаць, што гэтыя акцыі Германіі азначалі і крах палітыкі яе прымірэння, якую да таго часу праводзілі заходнія дзяржавы, хоць гэты крах не адразу быў усвядомлены іх урадавымі коламі. На чарзе як патэнцыяльная ахвяра агрэсіі нацысцкага рэйха ўстала Польша. На жаль, пры трактоўцы яе ролі ў перадваенным палітычным крызісе аўтару раздзела

здрадзіла пачуццё прафесійнай асцярожнасці, стрыманасці, ён апынуўся пад уплывам нядобраякаснай, хутчэй ідэалагічнай, чым навуковай літаратуры. Гэта праявілася перш за ўсё ў сцвярджэнні аб тым, што ў ходзе перагавораў польскага міністра замежных спраў Ю. Бека з кіраўнікамі Рэйха 5–6 студзеня 1939 г. ён «пацвердзіў гатоўнасць Польшчы супрацоўнічаць з фашысцкім Рэйхам у вайне супраць СССР» (с. 231). Гэта сцвярджэнне да сёняшняга дня не знайшло (і думаем, што і не знойдзе) абгрунтавання ў гістарычных крыніцах, перакананы ў гэтым, паколькі дакументы з нямецкага і польскага боку даволі поўна і ясна перадаюць змест названых перагавораў [гл.: *Год кризиса. 1938–1939: Док. и мат-лы. — В 2 т. — Т. 1. 29 сент. 1938 г. — 31 мая 1939 г. — М. : Политиздат, 1990. — С. 168–177*; гл. таксама запіс размовы Ю. Бека з Рыбентропам 26 студзеня 1939 г.: там жа. — С. 194–196]. Мала таго што гэтыя дакументы не даюць падстаў сцвярджаць аб наяўнасці згоды Польшчы ўдзельнічаць у вайне супраць СССР у якасці саюзніка Германіі, яны паказваюць, што польскі міністр быў вымушаны тлумачыць Гітлеру неабходнасць для Польшчы мірных адносін з СССР як са сваім другім вялікім суседам. Па гэтай жа прычыне ён адназначна адхіліў прапанову краўнікоў Рэйха аб далучэнні да Антыкамінтэрнаўскага пакта, нягледзячы на перспектыву «шырокага» і канчатковага ўрэгулявання ўсіх існуючых паміж Германіяй і Польшчай праблем, якой Гітлер і Рыбентроп спакушалі польскага міністра (там жа, с. 176). А гаворка вялася аб Данцыгу, польскім «калідоры» і Украіне.

Праўда, Бек не выключыў перспектыву эвалюцыі палітыкі Польшчы ў адпаведным накірунку, аднак гэта заўвага была толькі спосабам некалькі залагодзіць прыкрае ўражанне, якое аказала на кіраўнікоў Рэйха выказанае ім негатыўнае стаўленне да ўдзелу Польшчы ў Антыкамінтэрнаўскім пакце. Нацысцкі рэжым гатовы быў задаволіцца толькі станоўчым адказам на яго прапанову. На нашу думку, польскі сюжэт у пытанні аб узнікненні міжнароднага палітычнага крызісу 1939 г. неабходна было завяршыць указаннем на факт канчатковай адмовы Польшчы задаволіць германскія патрабаванні, якая змяшчалася ў мемарандуме, уручаным польскім паслом Рыбентропу 26 сакавіка. Больш Германія да іх не вярталася, а перайшла да палітыкі шантажу і ізаляцыі Польшчы. Як вядома, 3 красавіка Гітлер выдаў дырэктыву аб падрыхтоўцы плана вайны супраць Польшчы, а 28 красавіка абвясціў аб разрыве дэкларацыі 1934 г. аб узаемным непрымяненні сілы.

У гэтай сітуацыі аб’ектыўна на авансцэну еўрапейскай палітыкі выходзіў СССР. Пачалася барацьба за яго прыхільнасць паміж Германіяй і дзяржавамі Захаду, якая вядома чым скончылася. Аўтар уважліва, наколькі гэта дазваляе аб’ём дапаможніка, разглядае ход гэтай барацьбы. Перамогу ў ёй Германіі, што выразілася ў заключэнні ёю з СССР дагавора аб ненападзенні з яго сакрэтным пратаколам, аўтар тлумачыць узаемадзеяннем шэрагу фактараў. Гэта і падпарадкаванне савецкай знешняй палітыкі асабіста Сталіну, і вяртанне ў ёй да наступальных мэтаў, у якіх сумяшчаліся і тэрытарыяльныя набыткі, і геаграфічнае пашырэнне сістэмы сацыялізму на іх аснове. Важнае значэнне мела нерашучасць заходніх дзяржаў, іх нежаданне пайсці насустрач савецкім патрабаванням. Аўтар падкрэслівае, што савецкае кіраўніцтва дало прынцыповую згоду ўраду Гітлера абмяркоўваць вылучаныя ім прапановы, якія ўключалі, сярод іншага, тэрытарыяльны перадзел Усходняй Еўропы, яшчэ да пачатку абмеркавання на англа-франка-савецкіх перагаворах, пытання аб ваеннай канвенцыі, а разам з гэтым і пытання аб праходзе савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі. Такое заключэнне зроблена на аснове вывучэння дакументаў, уведзеных у навуковы ўжытак незадоўга да выхаду дапаможніка ў свет [гл. *Документы внешней политики. — 1939 г. — Т. XXII. — В 2 кн. — Кн. 1: Январь-август. — М., 1992*].

Тэматыка міжнароднага палітычнага крызісу 1939 г. закранаецца і ў іншым раздзеле дапаможніка — у тэме, прысвечанай месцу Беларусі ў міжнародных адносінах. Але яна тут менавіта «закранаецца», бо, як паказаў аўтар раздзела, прафесар У. Е. Снапкоўскі, «ні БНР, ні БССР не ўдалося зацвердзіцца ў еўрапейскай супольнасці незалежных дзяржаў» (с. 306). Гэту вымушаную сваю няўвагу да праблемы міжнароднага палітычнага крызісу 1939 г. Снапкоўскі даволі ўдала кампенсуе ў іншых публікацыях (гл.: *Аб антыпольскім дыпламатычным і ваенным супрацоўніцтве СССР і Германіі (ліпень — верасень 1939 г.) / Снапкоўскі, У. Е. Беларуска-польскія адносіны (1918–1989 гг.): даследаванні, дакументы, ілюстрацыі, карты. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2013. — С. 36–50*). Абапіраючыся на комплекс дакументаў, які ўключае і ўзятыя з архіваў ведамстваў міжнародных спраў Велікабрытаніі і СССР, аўтар паказаў, што пасля адмовы Польшчы ўдзельнічаць у падрыхтоўцы агрэсіі нацысцкага рэйха супраць савецкай дзяржавы Германія перайшла да цеснага супрацоўніцтва са сталінскім рэжымам, першым аб’ектам якога стала тая ж Польшча, яе фактычны падзел, а важнейшай стратэгічнай

мэтай рэйха ў гэтым супрацоўніцтве — прадухіленне сітуацыі двух франтоў у яго барацьбе з заходнімі дзяржавамі. Хоць грунт германа-савецкага пагаднення быў больш шырокім, але агрэсія супраць Польшчы была яго асновай. Аўтар прыводзіць першыя водгукі на пакт Молатава–Рыбентропа, прагучаўшыя на Захадзе.

На заключэнне застаецца канстатаваць, што даследаванні кафедры міжнародных адносін БДУ ўносяць адметны і значны ўклад у вывучэнне адной з найбольш складаных праблем гісторыі міжнародых адносін перадваеннага часу, яны цесна звязаныя з працэсам падрыхтоўкі кадраў для практычнай сферы і тым самым спрыяюць рашэнню задач знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.